Вертліб Л.

# ЗОРКА ГЕРОЯ

Залатая зорка Героя Савецкага Саюза – самая высокая ўзнагарода савецкага воіна. За ёю – найвышэйшае праяўленне чалавечага духа на вайне – подзвіг! А які подзвіг здзейсніў на фронце наш зямляк, ураджэнец вёскі Машавое Фядос Міхайлавіч Аўхачоў? Аб гэтым і пойдзе расказ.

Ішоў апошні год Вялікай Айчыннай вайны. Войскі 2-га Беларускага фронта, праследуючы ворага, які адступаў, фарсіравалі раку Віслу і выйшлі да гарадоў Гданьск і Гдыня. Тут і быў пакладзен пачатак подзвігу маёра, камандзіра танкавага батальёна Ф. М. Аўхачова, працяг якога і быў у логаве ворага – у фашысцкай Германіі.

Вось што расказвае аб мужнасці нашага земляка ўзнагародны ліст – прадстаўленне Ф. М. Аўхачова да звання Героя Савецкага Саюза:

"Камандзір 3-га танкавага батальёна маёр Аўхачоў у часе баявых дзеянняў брыгады праявіў выключную смеласць, адвагу і мужнасць...

У баях за авалоданне горадам Нойштат, ведучы сваю машыну ўперадзе баявых парадкаў батальёна і ўмела кіруючы ім, маёр Аўхачоў ажыццявіў абыходны манеўр з поўначы горада і ў цесным узаемадзеянні з байцамі 326 стралковага палка ўварваўся на ўскраіну горада, забяспечыўшы тым самым выкананне пастаўленай задачы. У гэтым баі маёр Аўхачоў асабіста знішчыў самаходную гармату праціўніка.

У баях за горад Гдыню, будучы раненым, маёр Аўхачоў не пакінуў поля боя, а працягваў камандаваць батальёнам, знаходзячыся ў сваім танку ў баявых парадках падраздзялення на працягу трох дзён.

Праяўляючы выключную мужнасць і адвагу, умела ідучы на ворага ўперадзе баявых парадкаў батальёна і захапляючы асабістым прыкладам камандзіраў усіх танкаў, маёр Аўхачоў за перыяд гэтых аперацый знішчыў адну самаходную гармату, дзесяць гармат, да ста чалавек пяхоты ворага. Захоплены вялікія трафеі".

Такія скупыя словы ўзнагароднага ліста. Прадстаўленне было падпісана камандуючым войскамі 2-га Беларускага фронта Маршалам Савецкага Саюза К. К Ракасоўскім. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Ф. М. Аўхачову было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Трэба адзначыць, што апрача ордэна Леніна і Залатой зоркі Героя бясстрашша Аўхачова адзначана ордэнам Чырвонага сцягу, медалем "За баявыя заслугі" і шасцю польскімі ўзнагародамі.

Фядос Міхайлавіч Аўхачоў нарадзіўся ў 1909 годзе, у вёсцы Машавое нашага раёна. Тут ён навучаўся ў школе, працаваў у калгасе, адсюль у 1931 годзе быў прызван у рады Савецкай. Арміі. Служыць

Аўхачову давялося спачатку ў Магілёве і Чавусах, а потым ён скончыў курсы аўтатэхнікаў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны змагаўся з ворагамі нашай Радзімы на Заходнім фронце, а пасля – на 1-м і 2-м Беларускіх франтах.

**Вертліб, Л. Зорка Героя / Леанід Вертліб // Сцяг камунізма (Касцюковічы). — 1964. — 25 красавіка. — С. 4.**